ISSN 1993-1999

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



8 2010

**8 (133)**
**жнівень**

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

**НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС**

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны універсітэт**

***Рэдакцыйная калегія:***

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

**Сымон Барыс** (рэдактар аддзела), **Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч** (намеснік галоўнага рэдактара), **Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер** (рэдактар аддзела), **Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Барыс Ляпешка, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Вячаслаў Селяменеў, Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***

**Уладзімір Адамушка, Тамара Анціхові, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Васіль Бушчык, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, Іван Крэнь, Валерый Марозаў, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі, Антон Мірановіч, Сяргей Новікаў, Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Таццяна Румянцава, Віталь Скалабан, Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.**

## ЗМЕСТ

ДА 600-ГОДДЗЯ ГРУНВАЛЬДСКАЙ БІТВЫ

Святлана Марозава — Святкаванне 600-годдзя Грунвальдскай бітвы — 3

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Міхаіл Цуба — Партызанскі рух на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны — 9

ДЗЯРЖАВА І ПРАВА

Вольга Папко — Арганізацыя паляванняў у ардынацыях князёў Радзівілаў у канцы XIX—пачатку XX ст. — 13

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Юрый Лаўрык — Рукапісная кніга ў Куцейне — 20

Ніна Змачынская — З гісторыі збораў медыцынскіх кніг у Беларусі *(да 70-годдзя Рэспубліканскай навуковай медыцынскай бібліятэкі)* 28

## ЛЮДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

Васіль Кушнер, Аляксандр Каханоўскі, Людміла Кулеш — Выдатны чалавек і глыбокі даследчык гісторыі Бацькаўшчыны *(да 75-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Канстанцінавіча Коршука)* 36

## МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

Алег Жук — Урок гісторыі майстар-класа *(метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы і правядзенню ўрока майстар-класа)* 40

Данута Валасевіч — Навучанне гісторыі з выкарыстаннем тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо 46

Людміла Паўлава — Выкарыстанне камп'ютара на ўроках гісторыі 51

Надзея Капуза — Усталяванне новай культуры. Фарміраванне навуковай карціны свету *(VIII клас)* 58

Юлія Усманава — Рэвалюцыя ў Нідэрландах (1566—1609 гг.) *(VIII клас)* 63

Ніна Качко — Рэфармацыя ў Германіі *(VIII клас)* 66

Галіна Бяляева — Агульная характарыстыка развіцця краін Еўропы і Амерыкі пасля 1945 г. *(X клас)* 70

Содержание 79

Summary 80

*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 04.07.2005 г. № 101 «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, педагагічных, філасофскіх і юрыдычных навуках, а таксама ў адпаведнасці з загадам ад 05.10.2005 г. № 143 — па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*

*Адрас рэдакцыі: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1, пакой 402; 220050, Мінск, вул. Ленінградская, 14, пакой 707. Тэлефоны: (017) 284-02-20, 209-54-63; факс: 284-02-20.*
**http://aiv.by; e-mail: aiv@aiv.by, bhc@aiv.by.**
**РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**
Падпісана да друку 06.08.2010 г.
Выхад у свет 20.08.2010 г. Афсетны друк.
Фармат 60х84$^{1}/_{8}$.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11.
Наклад 1 182 асобнікі. Зак. 1087.
*Надрукавана ў друкарні ААТ «Прамдрук».*
*Ліцэнзія № 02330/0494112 ад 11.03.2009 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*

**Да ведама аўтараў!**
За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 16 старонак (кегель 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экземплярах (пажадана з дыскетай). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), дакладны адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.

УВАГА!
Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютарнай настольна-выдавецкай сістэмы.

© «Беларускі гістарычны часопіс», 2010.

Міхаіл ЦУБА

# Партызанскі рух на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны



*ЦУБА Міхаіл Віктаравіч — дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1957 г. у в. Навіна Салігорскага р-на. У 1985 г. закончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М.Горкага, у 1996 г. — аспірантуру БДПУ імя Максіма Танка. Вывучае праблемы грамадска-палітычнага жыцця і ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Аўтар прац "Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 — люты 1917 гг.): матэрыялы да курса "Гісторыя Беларусі" (Брэст, 2003); "Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютаўскай рэвалюцыі (жнівень 1914— люты 1917 гг.): матэрыялы да курса "Гісторыя Беларусі" (Мінск, 2006); "Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914—1918 гг." (Пінск, 2010), больш за 50 навуковых публікацый.*

Як вядома, 1 жніўня 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна, а праз год, у жніўні 1915 г., беларускія землі апынуліся ў эпіцэнтры ваенных дзеянняў паміж расійскімі і германскімі войскамі. З таго часу прайшло 95 гадоў, аднак не ўсе пытанні гісторыі вайны дастаткова распрацаваны ў гістарыяграфіі. З'яўляюцца даследаванні, аўтары якіх імкнуцца праліць святло на гісторыю бежанства, разглядаюць пытанні культурнай і палітычнай працы розных нацыянальных партый і арганізацый у гады Першай сусветнай вайны. Аднак па-ранейшаму многія пытанні гісторыі Першай сусветнай вайны яшчэ не вывучаны. Адным з іх з'яўляецца разгортванне на беларускіх землях партызанскага руху. Гэтае пытанне і па сённяшні дзень застаецца адной з "белых плям" айчыннай гісторыі.

Растлумачыць гэта можна шэрагам прычын.

Па-першае, у сілу розных абставін (прымянення тактыкі "спаленай зямлі", размаху бежанства, перапоўненасці беларускіх населеных пунктаў войскамі, адсутнасці істотнай падтрымкі сярод насельніцтва) партызанскі рух у гады Першай сусветнай вайны не набыў дастаткова значнага размаху.

Па-другое, у гістарыяграфіі бытавала меркаванне, што партызанскі рух змог сябе праявіць толькі ў апошні год вайны, а тое, што было да Кастрычніцкай рэвалюцыі, не лічылася вартым увагі, бо звязвалася з царызмам.

Па-трэцяе, доўгія гады асноўныя сілы даследчыкаў гісторыі былі накіраваны на вывучэнне падзей (у тым ліку партызанскага руху) перыяду Другой сусветнай вайны.

У гэтым артыкуле мы паспрабуем сабраць разрозненыя звесткі аб дзейнасці партызанскага руху на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны.

Да канца лета 1915 г. значная частка беларускіх зямель была акупіравана кайзераўскімі войскамі. Разважаючы аб тым, наколькі карысныя былі партызанскія дзеянні падчас Айчыннай вайны 1812 г., расійскае камандаванне імкнулася разгарнуць шырокамаштабную партызанскую вайну на акупіраваных немцамі тэрыторыях.

Арганізацыя партызанскай барацьбы на беларускіх землях пачалася з верасня 1915 г. Менавіта тады ў Стаўцы вярхоўнага галоўнакамандуючага вялікага князя Мікалая Мікалаевіча ў Магілёве было падрыхтавана "Настаўленне для арганізацыі партызанскіх атрадаў", якое паклала пачатак разгортванню партызанскага руху. На працягу кастрычніка—лістапада 1915 г. было створана 28 атрадаў: 11 — на Паўднёва-Заходнім фронце, 11 — на Заходнім фронце, 6 — на

Паўночным фронце. Агульнае кіраўніцтва партызанскім рухам было ўскладзена на вялікага князя Барыса Уладзіміравіча, штаб-кватэра якога знаходзілася ў Магілёве пры Стаўцы вярхоўнага галоўнакамандуючага[1].

Планавалася, што найбольш актыўным партызанскі рух павінен стаць у рэгіёне беларускага Палесся, дзе па прычыне складаных умоў мясцовасці (наяўнасць леса і балот) праціўнік не мог стварыць суцэльнай лініі абароны, і гэта дазваляла партызанам лёгка пераходзіць лінію фронту.

Ужо ў канцы 1915 г. у наваколлі Пінска пачалі дзейнічаць першыя партызанскія групы. Пэўную дапамогу ім аказвалі жыхары некаторых уцалелых вёсак. Яны былі праваднікамі, давалі прытулак, забяспечвалі партызан харчаваннем. Кіраўніцтва партызанскай барацьбой на Піншчыне ажыццяўляў А.М.Ільін[2].

Аднак ні на Піншчыне, ні ў іншых мясцовасцях партызанскі рух не набыў шырокага размаху. І гэта зразумела, паколькі ён не меў надзейнай апоры сярод мясцовых жыхароў. Да таго ж на акупіраваных землях мала засталося і самога насельніцтва. Як правіла, пры набліжэнні фронту ўсё дарослае насельніцтва прыцягвалася да выканання абарончых работ. Пасля гэтага ўлады імкнуліся любымі сродкамі накіраваць мясцовых жыхароў і шматлікіх бежанцаў з прыфрантавой паласы ў глыбокі тыл. Па загаду вярхоўнага галоўнакамандуючага Мікалая Мікалаевіча, прыхільніка тактыкі "спаленай зямлі", пакінутыя ворагу беларускія вёскі падлягалі знішчэнню. Гэта пацвярджаюць і афіцыйныя звесткі германскага генеральнага штаба: "Уся мясцовасць, па якой адступаў праціўнік, была нямым сведкам супраць падпальшчыкаў уласнага народа. Усюды, куды не прыходзілі нашы войскі, яны знаходзілі пакінутыя і людзьмі, і жывёламі груды камянёў, на якіх то тут, то там тырчалі трубы. Даволі рэдка траплялiся цэрквы, над якімі зліталіся нават казакі. Вось і ўсё, што ўцалела на шляху адступаючых расійскіх армій"[3].

Аднак такі падыход не мог не накласці свой адмоўны адбітак на адносіны мясцовых жыхароў да партызан, якія дзейнічалі пад эгідай расійскай арміі.

Да таго ж, акрамя "тутэйшых" партызан, якім у істотнай ступені ўсё ж удавалася знайсці паразуменне з мясцовым насельніцтвам, на Палессі дзейнічалі таксама партызанскія атрады, накіраваныя камандаваннем Паўднёва—Заходняга фронту з тэрыторыі Украіны. Аб іх генерал А.А.Брусілаў расказваў наступнае: "Іваноў (галоўнакамандуючы Паўднёва-Заходнім фронтам. — **М.Ц.**), узяўшы прыклад з вайны 1812 года, загадаў сфарміраваць ад кожнай дывізіі ўсіх армій фронту па партызанскаму атраду, потым даў ім загад рушыць на паўночны захад Палесся, дазволіў пры гэтым поўны прастор для дзеянняў. ...Здараліся бясконцыя непаразуменні з мясцовымі жыхарамі, прычым, прызнаючы толькі асабіста Іванова, гэтыя партызаны здзяйснялі безліч рабункаў і мелі вельмі малую схільнасць ваяваць з ворагам. У апошнім я іх цалкам апраўдваў, бо на Пінскіх балотах рабіць конныя набегі было немагчыма, і яны нават калі б і хацелі весці конныя баі, усё роўна ні ў якім выпадку не змаглі б гэтага выканаць"[4].

Што тычыцца рабункаў, то на Піншчыне здараліся такія выпадкі, аб якіх пісаў у адным з дакладаў мінскаму губернатару А.Гірсу пінскі спраўнік. Ён паведаміў, што ў прыфрантавой паласе "з крымінальных злачынстваў болей вядомых з'яўляецца выпадак забойства, з мэтай рабунку, у ноч на 10 снежня 1915 года двума невядомымі казакамі-партызанамі мяшчан ваколіцы Сернічкі — Пятра, Андрэя, Івана Палюховічаў і раненне ў галаву Карла Палюховіча"[5].

Безумоўна, балоцісты раён Агінскага канала не мог стаць спрыяльным месцам для паўнамаштабных ваенных дзеянняў кавалерыйскіх атрадаў. Але пры дапамозе мясцовых жыхароў і пры расцягнутасці нямецкай абароны і стварэнні яе ў выглядзе сістэмы блакгаузаў (умацаваных пунктаў), расійскім войскам удалося здзейсніць тут дзве сапраўды унікальныя аперацыі.

Спачатку партызанам з атрада 7-й кавалерыйскай дывізіі, дзе служыла шмат палешукоў, удалося дамовіцца з бежанцамі з Пінскага павета, якія знаходзіліся ў прыфрантавым фальварку Вялічкава, аб пераходзе лініі фронту.

Адзін з іх па прозвішчу Кавальчук, які шмат гадоў працаваў ляснічым і добра ведаў мясцовасць, змог правесці 250 партызан праз абарону праціўніка. Гэтыя партызаны з дапамогай праваднiка з мясцовых сялян непрыкметна падышлі да вёскі Кухоцкая Воля (поўдзень Пінскага павета) і ноччу 20 кастрычніка 1915 г. атакавалі нямецкі гарнізон, што знаходзіўся ў гэтай вёсцы. Праціўнік страціў больш за 400 чалавек і ўвесь абоз, партызаны захапілі пяць палонных. Страты партызан былі наступныя: адзін забіты, трыццаць параненых і двое зніклі без вестак[6].

Яшчэ больш вядомая аперацыя партызан, якую ўзгадвалі многія военачальнікі, у тым ліку генерал А.Брусілаў, адбылася ў лістападзе 1915 г. Партызанскім атрадам, што знаходзіліся ў раёне ракі Прыпяць і падпарадкоўваліся камандаванню Паўднёва-Заходняга фронту, дзякуючы сялянам Пінскага павета стала вядома, што ў фальварку Невель (26 км на паўднёвы захад ад Пінска) размешчаны штаб 82-й рэзервовай дывізіі нямецкіх войскаў. Высланыя групы разведкі пацвердзілі гэтыя звесткі. На агульным савеце камандзіраў атрадаў было вырашана правесці раптоўную аперацыю супраць ворага. У створаны з гэтай мэтай зводны партызанскі атрад увайшлі атрады з Арэнбургскай, Цвярской, Данской казацкіх дывізій, а таксама з гвардзейскіх і кавалерыйскіх дывізій. Агульнае кіраўніцтва зводным партызанскім атрадам колькасцю 350 чалавек ажыццяўляў палкоўнік А.Астраградскі, аднак фактычна аперацыяй па разгрому нямецкага гарнізона ў фальварку Невель (колькасцю больш за 700 салдат і афіцэраў) кіраваў яго намеснік, ураджэнец суседняй з Невелем вёскі Махро, афіцэр расійскай арміі, поўны кавалер Георгіеўскага крыжа Сідар Іванавіч Паўлюкавец[7].

У ноч з 14 на 15 лістапада 1915 г. партызаны разам з мясцовымі праваднікамі прайшлі па балоту і хмызняку, абмінулі дазоры праціўніка і падышлі да фальварка Невель. Па агульнай камандзе яны закідалі гранатамі хаты, дзе размяшчаліся кайзераўскія салдаты. Найбольшага поспеху дасягнула група партызан, што атакавала панскую сядзібу. Менавіта тут прапаршчыкам У.Янбулатавым, драгунамі П.Кузняцовым і А.Хрыпуновым быў захоплены ў палон камандзір нямецкай 82-й рэзервовай дывізіі генерал-маёр Зігфрыд Фабарыус.

У данясенні камандаванню расійскай арміі адзначалася, што падчас бою праціўнік быў амаль поўнасцю знішчаны (забіта каля 600 салдат і больш за 20 афіцэраў). Акрамя таго былі знішчаны істотныя запасы ваеннай маёмасці. Партызаны страцілі 6 чалавек забітымі, 49 — параненымі, двое зніклі без вестак. Аб значнасці прыведзенай аперацыі сведчыць той факт, што з абставінамі яе быў азнаёмлены імператар Мікалай II. Ён узнагародзіў за ўдзел у гэтай аперацыі больш за 300 партызан, 20 з іх — Георгіеўскімі крыжамі[8].

Ёсць звесткі аб пэўных партызанскіх дзеяннях і ў цэнтральнай частцы беларускіх зямель у 1915—1916 гг. Вядома, што ноччу 15 лютага 1916 г., напярэдадні Нарачанскай бітвы (сакавік 1916 г.), партызаны, накіраваныя камандаваннем Заходняга фронту, здзейснілі глыбокі рэйд па тылах кайзераўскіх войскаў. Яны паспяхова перайшлі лінію фронту па лёдзе возера Нарач, ліквідавалі некалькі нямецкіх дазораў, а таксама ўзарвалі важны стратэгічны аб'ект — чыгуначны мост. У выніку падвоз жывой сілы і тэхнікі праціўніка перапыніўся на тры дні. Нямецкія друкаваныя выданні адзначалі, што напады "паляўнічых каманд" і партызан увесь час трымалі тут германскія войскі ў напружаным стане[9].

У цэнтральнай частцы Беларусі дзейнічалі таксама партызанскія атрады пад камандаваннем вядомых пазней белагвардзейскіх атаманаў Андрэя Шкуро і Барыса Аненкава. На паўднёвых беларускіх тэрыторыях час ад часу праяўлялі актыўнасць партызанскія атрады пад агульным камандаваннем барона Рамана Інгерн-Штэрнберга, якія базіраваліся на Украіне. У 1916—1917 гг. у паўночнай частцы Беларусі мелі месца смелыя вылазкі партызан на чале са Станіславам Булак-Балаховічам, месцам дыслакацыі якіх з'яўляліся прыбалтыйскія тэрыторыі.

Аднак ужо ў 1916 г. расійскае камандаванне пачало згортваць партызанскі рух. Усім армейскім партызанскім атрадам было загадана тэрмінова вярнуцца ў свае вайсковыя фарміраванні. Асноўныя прычыны такога рашэння былі наступныя: цяжкасці пераадольвання коннымі атрадамі створанай амаль суцэльнай лініі фронту праціўніка; слабая падтрымка армейскіх партызанскіх атрадаў з боку мясцовага насельніцтва і некаторыя канфлікты і непаразуменні паміж партызанамі і мясцовымі жыхарамі; нежаданне партызан узаемадзейнічаць са сваімі войскамі і праводзіць разам з імі сумесныя баявыя аперацыі і г.д.

Трэба адзначыць, што да 1918 г. у кайзераўскага камандавання хапала сродкаў і магчымасцей для таго, каб утрымліваць становішча ў тылах сваіх войскаў пад кантролем. Ва ўмовах жа германскага наступлення, якое пачалося 18 лютага 1918 г., дэмаралізацыі і развалу фронту бальшавіцкае кіраўніцтва страціла не толькі цэнтральную, але і значную частку ўсходніх беларускіх зямель. На акупіраванай тэрыторыі ў практыку ўвайшлі рэквізіцыі хлеба, мяса, адзення, фуражу. Мірных жыхароў прымусова вывозілі на працу ў Германію альбо на пабудову розных фартыфікацыйных умацаванняў. Мелі месца расстрэлы за выступленні супраць германскіх акупацыйных улад, ствараліся канцэнтрацыйныя лагеры. Дапамога партызанам (прадастаўленне харчавання, адзення, укрыццё ад акупацыйных улад) каралася турэмным зняволеннем тэрмінам не менш чым на 5 гадоў. За непасрэдны ўдзел у партызанскім руху людзей чакала смяротнае пакаранне. У тых мясцовасцях, дзе дзейнічалі партызанскія атрады, акупацыйныя ўлады праводзілі карныя аперацыі, у ходзе якіх спальвалі вёскі, здзекаваліся з дзяцей, старых, жанчын[10].

Безумоўна, такая акупацыйная палітыка не магла не выклікаць супраціўлення. Найбольшую актыўнасць праяўлялі сялянскія масы. Вясной 1918 г. адбылося паўстанне сялян супраць акупантаў у Навагрудскім павеце, летам — у Слуцкім, Рэчыцкім, Бабруйскім, Быхаўскім паветах. Германскія ўлады паведамлялі, што сялянскі рух на беларускіх землях набывае масавы характар. Сяляне рабілі напады на невялікія нямецкія гарнізоны, пускалі пад адхон ваенныя эшалоны, падпальвалі склады, стваралі партызанскія атрады. Да канца лета 1918 г. кіраўніцтва гэтым народным рухам у цэнтральнай і заходняй частках Беларусі імкнуліся ўзяць у свае рукі прадстаўнікі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р). Яны заклікалі беларусаў абапірацца ў барацьбе з акупантамі толькі на свае ўласныя сілы, выступалі за стварэнне сялянскіх дружын і партызанскіх атрадаў. Пад эгідай эсэраў у жніўні 1918 г. сяляне вёскі Хвоева Навагрудскага павета аказалі супраціўленне атраду кайзераўскіх салдат, якія спрабавалі рэквізаваць у іх маёмасць і жывёлу. Узброіўшыся вінтоўкамі, сякерамі, каламі, сяляне ўступілі ў бой з акупантамі і прымусілі нямецкіх салдат уцякаць з вёскі. Падобныя выпадкі мелі месца таксама ў Гарадзейскай, Мірскай, Гарадзішчанскай і іншых валасцях[11].

Фактычна быў паралізаваны рух на чыгунках заходняй часткі Беларусі. У Баранавічах чыгуначнікі, якія дзейнічалі разам з партызанамі, не дазволілі нямецкім войскам вывезці 40 тыс. пудоў збожжа, больш за 50 тыс. пудоў жалеза, вялікую колькасць сельскагаспадарчага інвентару. Небяспечным станавіўся для немцаў і правоз нарабаванай маёмасці па шашэйных дарогах. Ёсць звесткі, што сяляне вёскі Чапліна і суседніх з ёю вёсак (недалёка ад Нясвіжа) адбілі ў акупантаў вялікі транспарт і абяззброілі атрад нямецкіх салдат, які яго ахоўваў[12].

Ва ўсходняй Беларусі найбольш актыўную прапаганду сярод насельніцтва праводзілі бальшавікі. Яны імкнуліся выканаць загад галоўнакамандуючага Заходнім фронтам А.Ф.Мяснікова аб арганізацыі ў прыфрантавой паласе партызанскіх атрадаў з мэтай аблегчыць тут становішча Чырвонай Арміі. Ёсць звесткі, што толькі на тэрыторыі Мінскага, Магілёўскага, Бабруйскага, Гомельскага, Рэчыцкага, Слуцкага і Быхаўскага паветаў існавала каля 100 партызанскіх атрадаў, у якіх налічвалася ад 200 да 700 партызан у кожным, а ў Полацкім павеце дзейнічала 13 тыс. партызан[13].

Асабліва значных поспехаў дасягнулі партызаны Рудабельскай воласці Бабруйскага павета на чале з А.Салаўём. Яны адстаялі воласць ад кайзераўскіх войскаў, і на працягу ўсяго перыяду акупацыі тут захоўвалася савецкая ўлада. Гэтая мясцовасць лічылася партызанскай зонай і атрымала назву "Рудабельская рэспубліка".

У хуткім часе партызанская барацьба супраць германскіх войскаў аднавілася і набыла моц на тэрыторыі пінскага Палесся. Да канца 1918 г. тут змагалася 15-ці тысячная партызанская армія, якая фактычна кантралявала Пінскую, Лунінецкую і Столінскую воласці. На Палессі дзейнічала каля сотні партызанскіх атрадаў, якія былі аб'яднаны ў тры паўстанцкія палкі. У кастрычніку 1918 г. пачалося Палескае паўстанне, цэнтрам якога стаў Пінскі павет. Першы Палескі полк пад камандаваннем А.Разановіча і другі Палескі полк пад камандаваннем Ф.Казубоўскага (трэці полк дзейнічаў на тэрыторыі Украіны) разгарнулі ваенныя аперацыі супраць нямецкіх войскаў на чыгуначнай лініі Сарны—Лунінец—Пінск. У канцы 1918 г. для агульнага кіраўніцтва паўстаннем у Століне быў створаны Палескі рэвалюцыйны ваенны камітэт (РВК) на чале з Р.М.Астроўскім[14].

Імкнучыся узяць пад сваю апеку партызанскі рух на Палессі, бальшавіцкае кіраўніцтва накіравала сюды вядомага па дзеяннях 1915 г. камандзіра партызанскага атрада А.М.Ільына. Ён меў значныя паўнамоцтвы, непасрэдна звязваўся па тэлеграфу з У.Леніным і Я.Свярдловым, у эпіцэнтр паўстання на станцыю Лунінец было выслана некалькі эшалонаў прабальшавіцкі настроеных войскаў. А.Ільін узначаліў агульнае кіраўніцтва ўсімі вайсковымі і паўстанцкімі сіламі ў заходнім палескім рэгіёне, абапіраўся ў сваёй дзейнасці на мясцовых жыхароў К.Р.Русака, Ф.А.Казубоўскага, С.М.Кавалевіча, Ф.І.Рамановіча, Р.М.Астроўскага і іншых. Вядома, што паўстанцы Палесся выдавалі сваю партызанскую газету пад назвай "Лесное эхо", членамі рэдкалегіі якой былі Ф.А.Казубоўскі, М.В.Вішнеўскі, Ф.І.Рамановіч, К.Ф.Русак, А.С.Карась[15].

Моцны ўплыў на далейшы ход падзей на беларускіх землях аказала лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. у Германіі. Нямецкі ўрад быў вымушаны адклікаць свае войскі з захопленых у ходзе вайны тэрыторый.

Такім чынам, на першым этапе барацьбы супраць акупацыйных германскіх войскаў (1915—1917 гг.) партызанскі рух на беларускіх землях у большасці сваёй існаваў у выглядзе вылазак у тыл ворага спецыяльна створаных для гэтага армейскіх атрадаў і фактычна не меў надзейнай апоры сярод мясцовага насельніцтва. З набліжэннем кайзераўскіх войскаў мясцовых жыхароў масава і часта прымусова выганялі з роднага краю, і яны ператвараліся ў бежанцаў, якім самім была неабходна дапамога. Не спрыяла разгортванню партызанскага руху і тактыка "спаленай зямлі", якую метадычна прымяняў на нашых землях галоўнакамандуючы расійскімі войскамі вялікі князь Мікалай Мікалаевіч. Паспяховымі былі толькі адзінкавыя аперацыі, непасрэдны ўдзел у якіх прымалі мясцовыя жыхары.

На другім этапе (1918—пачатак 1919 г.) партызанскі рух на беларускіх землях набыў масавы, народны характар, аднак застаўся стыхійным, нягледзячы на сваю маштабнасць і імкненне некаторых бальшавіцкіх і эсэраўскіх арганізацый узначаліць яго.

Падводзячы вынік, трэба адзначыць, што партызанскі рух не змог паўплываць на ход і характар Першай сусветнай вайны, як гэта было падчас Айчыннай вайны 1812 года, ці асабліва ў гады Другой сусветнай вайны. Тым не менш, пэўнае партызанскае супраціўленне ворагу на беларускіх землях у разглядаемы перыяд мела месца і час ад часу ставіла сур'ёзныя праблемы перад германскімі акупацыйнымі ўладамі.

---

[1] Белевская (Летягина) М. Ставка Верховного Главнокомандующего в Могилеве 1915—1918 (Личные воспоминания). Вильно, 1932. С. 12.

[2] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінска. Мн., 1998. С. 158.

[3] Мировая война в отдельных операциях. Бои на реке Зап. Буге летом 1915. Обработано по официальным данным Германского Генерального Штаба в 1917 году капитаном Пэльман. Петроград, 1921. С. 44—45.

[4] Брусилов А.А. Мои воспоминания. М., 1983. С. 169—170.

[5] НА РБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 9184, арк. 20.

[6] Заварошкин В. Партизаны Первой мировой // Белорусская военная газета. 2006, 28 октября. С. 7.

[7] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага р-на. Мн., 2000. С. 99—100.

[8] Заварошкин В. Партизаны Первой мировой // Белорусская военная газета. 2006, 28 октября. С. 7.

[9] Подорожный Н.Е. Нарочская операция в марте 1916 г. на русском фронте Мировой войны. М., 1938. С. 40.

[10] Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Т. 3. Мн., 1953. С. 794.

[11] Гісторыя БССР / Пад рэд. Л.С.Абэцэдарскага. Мн., 1967. С. 140.

[12] Там жа. С. 141.

[13] Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік / Пад рэд. А.П. Ігнаценкі, Я.Ю.Несцяровіча. Мн., 1994. С. 115.

[14] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Лунінецкага р-на. Мн., 1995. С. 218.

[15] Там жа. С. 221.